# АКЦЭНТЫ — НА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ: МІРЫ, СТАБІЛЬНАСЦІ І БЯСПЕЦЫ

**Дэлегаты сёмага Усебеларускага народнага сходу адкрытым галасаваннем аднагалосна прынялі Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну Рэспублікі Беларусь**

**Прадстаўляючы праект Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі перад прыняццем дакумента, Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ адзначыў, што, зыходзячы з аналізу абстаноўкі, дакумент аб'ектыўна патрабаваў карэкціроўкі і адаптацыі да сучасных рэалій. Гэта, па яго словах, выклікана тымі працэсамі і тэндэнцыямі ў сістэме міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі ў рамках трансфармацыі нашага грамадства, якія сфарміраваліся за апошнія 14 гадоў пасля прыняцця папярэдняй рэдакцыі Канцэпцыі.**


Фота БелТА.

## ЭВАЛЮЦЫЙНЫМ, А НЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ШЛЯХАМ

Аляксандр Вальфовіч расказаў, з якіх ключавых падыходаў зыходзілі, працуючы над Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі. «Па-першае, дакумент павінен развіваць базавыя палажэнні, якія замацаваны ў нашай Канстытуцыі, змяшчаць кірункі для іх абароны, — канкрэтызаваў ён. — Пры гэтым іх імплементацыя праводзілася не тэхнічна, а змястоўна, па сутнасці кожнага новага палажэння. Па-другое, шлях стварэння дакумента быў абраны эвалюцыйны, а не рэвалюцыйны. Ён захаваў пераемнасць у адносінах да дзеючай Канцэпцыі. Усё найлепшае, што пазітыўна зарэкамендавала сябе, у тым ліку і на практыцы, было захавана. Структура, базіс, тэарэтычная і метадалагічная аснова таксама засталіся без кардынальных змяненняў. Размова ідзе аб наступнай мадэлі. Што абараняем? Нацыянальныя інтарэсы. Ад чаго абараняем? Ад пагроз і іх крыніц. Як абараняем? Праз напрамкі іх нейтралізацыі. І хто абараняе? Сістэма забеспячэння нацыянальнай бяспекі».

Па-трэцяе, як звярнуў увагу дзяржсакратар Савета бяспекі, Канцэпцыя — гэта дакумент, які вызначае асноўныя пасылы, якія зразумела і адназначна ўспрымаюцца нашымі грамадзянамі.

Усе навоўведзенні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі аб'яднаны ў пяць буйных блокаў, у кожным з якіх адлюстраваны і адаптаваны змяненні. «**Першы блок** — удасканаленне базава-паняційнага апарату, ліквідацыя прабелаў, якія меліся, — паведаміў Аляксандр Вальфовіч. — Так, базавае паняцце «нацыянальная бяспека» дапоўнена мэтавым пасылам у выглядзе ўстойлівага развіцця для паступальнага руху грамадства да новага ўзроўню свайго існавання. «Нацыянальныя інтарэсы» дапоўнены асноватворным палажэннем Канстытуцыі аб грамадскай згодзе, непахіснасці асноў народаўладдзя і прававой дзяржавы. Гэтыя тэзісы непарыўна звязаны з важнай характарыстыкай нашай незалежнай дзяржавы — магчымасцю самім вызначаць сваю будучыню. У тым ліку гэта ўпершыню адлюстравана і ў паняцці электаральнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, якое прадугледжвае недапушчальнасць любога ўмяшання ў выбарчы працэс».

Адкарэкціраваны паняцці «крыніцы» і «пагрозы нацыянальнай бяспецы», упершыню дадзены вызначэнні рызыкі і выкліку нацыянальнай бяспецы. «Такі падыход дасць магчымасць усім упаўнаважаным суб'ектам больш эфектыўна ацэньваць стан нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і аператыўна прымаць меры рэагавання, — патлумачыў дзяржсакратар Савета бяспекі. — Акрамя таго, удакладнены і прыведзены да адзінага вызначэння ўсе паняцці бяспекі, у розных сферах».

**Другі блок** навоўведзенняў — у праекце Канцэпцыі закладзены тры аспекты сучаснай ацэнкі абстаноўкі. «Гэта метадалагічныя выхадныя даныя, якія даюць разуменне, у якіх умовах нам трэба будзе забяспечваць нацыянальную бяспеку, — адзначыў Аляксандр Вальфовіч. — Першы — на аснове комплекснага аналізу сфармуляваны асноўныя тэндэнцыі сучаснага свету, дадзена ацэнка іх развіцця на найбліжэйшую перспектыву, а таксама роля і месца Беларусі ў гэтым імклівым свеце, які змяняецца. Другі аспект — дадзена ацэнка бягучага стану нацыянальнай бяспекі з канкрэтнымі дасягненнямі і існуючымі праблемамі па ўсіх сферах. І, нарэшце, трэці аспект — у дачыненні да сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі Канцэпцыя напоўнена новым зместам вызначэння суб'ектаў. Да іх аднесены не толькі дзяржаўныя органы і арганізацыі, але і суб'екты грамадзянскай супольнасці, грамадзяне, якія рэалізуюць свае правы і абавязкі ў сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Гэта значыць, што, як і заўсёды было ў нашай гісторыі, уся краіна ўставала на абарону сваёй Айчыны».

**Трэці блок** змяненняў звязаны з новым напаўненнем шэрагу базавых палажэнняў Канцэпцыі. Размова ідзе аб нацыянальных інтарэсах Беларусі, пагрозах і асноўных напрамках па іх нейтралізацыі. Па словах дзяржсакратара Савета бяспекі, вылучаны новыя нацыянальныя інтарэсы, у іх ліку — пытанні нацыянальнай самабытнасці, дабрабыт і росквіт, развіццё суб'ектаў грамадзянскай супольнасці з улікам нацыянальных традыцый, грамадская згода, непахіснасць асноў народаўладдзя і прававой дзяржавы, забеспячэнне ваеннай бяспекі і ўзброенай абароны краіны ў любых умовах ваенна-палітычнай абстаноўкі.

Сфарміраваны новыя пагрозы нацыянальнай бяспецы. Сярод найбольш значных — дэструктыўнае ідэалагічнае ўздзеянне на насельніцтва, умяшанне звонку ў арганізацыю і правядзенне выбараў, парушэнне кіберустойлівасці дзяржаўных інфармацыйных сістэм.

**Чацвёрты блок** навоўведзенняў — у выніку комплекснай прапрацоўкі пытання біялагічная бяспека ўтварыла ў Канцэпцыі самастойную сферу з улікам усіх сусветных зрухаў, якія выклікаюць сучасныя біялагічныя пагрозы. «Варта ўлічваць, што падзеі вакол спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне ўзмацнілі інтэнсіўнасць абмеркавання пытанняў аб біялагічнай зброі і рызык функцыянавання заходніх біялабараторый у постсавецкіх краінах», — заўважыў Аляксандр Вальфовіч.

**Пяты блок** змяненняў звязаны з пераглядам сістэмы індыкатараў, якія выкарыстоўваюцца для ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі. Удакладнены і пералік сіл забеспячэння нацыянальнай бяспекі Беларусі.

Рэзюмуючы, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі адзначыў, што ў Канцэпцыі ўлічаны прапановы, якія паступілі ад кіраўнікоў асноўных канфесій, перш за ўсё ад Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама ад Беларускага саюза жанчын, партыі «Белая Русь», Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі аб дадатковай абароне традыцыйнай сям'і як саюза мужчыны і жанчыны па нараджэнні. «Гэта дазволіць дадаткова абараніць інстытут беларускай сям'і, павысіць эфектыўнасць забеспячэння дэмаграфічнай бяспекі, — перакананы ён. — Па выніках сустрэчы з актывам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, аблвыканкамаў, працоўнымі калектывамі ў рэгіёнах дапоўнілі Канцэпцыю палажэннямі аб павышэнні сацыяльнай адказнасці бізнесу і недапушчэнні дыспрапорцыі рэгіянальнага развіцця».

## АДКРЫТАСЦЬ — ГАРАНТ ПАДТРЫМАННЯ МІРУ

У ходзе абмеркавання Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі **дэлегат Усебеларускага народнага сходу ад Гомельскай вобласці старшыня Лельчыцкага райвыканкама Сяргей ДЫЛЮК** спытаў у дзяржсакратара, наколькі апраўдана сёння такое адкрытае абмеркаванне Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі ва ўмовах бягучай ваенна-палітычнай абстаноўкі вакол нашых граніц, асабліва ўлічваючы тое, што ў многіх краінах гэты дакумент носіць закрыты характар.

Аляксандр Вальфовіч адзначыў, што гэтае пытанне неаднаразова задавалася ў ходзе адкрытых абмеркаванняў і на дыскусійных пляцоўках. «Да стварэння нашай незалежнай суверэннай дзяржавы, увядзення інстытута прэзідэнцтва ў нашай краіне такія дакументы сапраўды насілі закрыты характар, — нагадаў ён. — З увядзеннем інстытута прэзідэнцтва кіраўніком дзяржавы ў ліку прыярытэтных пытанняў было пастаўлена пытанне аб стварэнні такога дакумента, як Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі. І першая Канцэпцыя была прынята ў 1995 годзе, і яна ўжо тады мела адкрыты характар, што, на мой погляд, абсалютна правільна і аб'ектыўна. І ўсе наступныя дакументы, якія карэкціраваліся, таксама мелі адкрыты характар. Гэты дакумент паказвае адкрытасць нашай дзяржавы, сведчыць аб тым, што ўвесь народ павінен разумець тое, што адбываецца ў свеце, якая ваенна-палітычная абстаноўка непасрэдна вакол Рэспублікі Беларусь. Пры неабходнасці кожны народ павінен устаць на абарону сваёй краіны, а каб стаць на яе абарону, павінен разумець, якая абстаноўка, якія нацыянальныя інтарэсы, якія сферы бяспекі, якія пагрозы па кожнай сферы бяспекі і як нейтралізаваць іх. У Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі акурат усё гэта выкладзена, таму наш народ павінен гэта разумець».

Па словах дзяржсакратара, такія дакументы, якія носяць адкрыты характар, садзейнічаюць падтрыманню міру і бяспекі не толькі ў Беларусі, але і ў свеце ў цэлым.

**Дэлегат УНС ад Брэстчыны першы сакратар БРСМ Камянецкага раёна Лізавета БАСАЛАЙ** заўважыла, што насельніцтва прымала актыўны ўдзел у абмеркаванні гэтага найважнейшага дакумента. Яна падзялілася меркаваннем, што Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі прымушае ўсіх задумацца аб будучыні і ці зможам мы ўсе разам зрабіць яе бяспечнай і мірнай. У сувязі з гэтым дэлегат удакладніла, наколькі далёка ўдалося зазірнуць за гарызонт, распрацоўваючы Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, і на які тэрмін яна разлічана.

Аляксандр Вальфовіч адзначыў: прыемна, што моладзь цікавіцца такімі пытаннямі, што было відаць і падчас дыскусійных пляцовак. Ён расказаў, што папярэдняя Канцэпцыя была прынята 14 гадоў таму. «Гэтыя дакументы сапраўды стратэгічнага планавання, яны павінны заглядваць далёка за гарызонт, вызначаць прыярытэты для развіцця нашай краіны, — перакананы дзяржсакратар Савета бяспекі. — Жыццё ідзе наперад, геапалітычная абстаноўка мяняецца, з'яўляюцца новыя выклікі, рызыкі, пагрозы для нацыянальнай бяспекі, таму дакумент патрабаваў аб'ектыўнай карэкціроўкі. У ім па-новаму выкладзена бачанне нашай краіны на геапалітычную абстаноўку, на тыя сучасныя выклікі і пагрозы, на тыя чырвоныя лініі, якія нельга пераступаць. Таму, працуючы над гэтым дакументам, мы спрабавалі зрабіць запас трываласці перш за ўсё, каб гэты дакумент мінімум гадоў на дзесяць быў запатрабаваны і ім можна было кіравацца».

## «ВАМ ТРЭБА БУДЗЕ АДКАЗВАЦЬ ЛЮДЗЯМ»

У сваю чаргу, Старшыня Усебеларускага народнага сходу расказаў, што, калі ўзнікла пытанне аб абнаўленні Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, былі розныя прапановы, як будзем абмяркоўваць. «Мы ж на Савеце бяспекі абмяркоўвалі ў закрытым рэжыме гэтыя праблемы, нават шырэй, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Спрэчкі былі, ці варта нам усё гэта выносіць на публічнае абмеркаванне. Тады было прынята рашэнне — а нам чаго баяцца? Бо галоўная задача — супрацьстаяць, калі трэба будзе. А як супрацьстаяць будзе народ, калі ён не ведае загадзя, чаму ён будзе супрацьстаяць?».

Невыпадкова было прынята рашэнне давесці ўсю неабходную інфармацыю да народа. І гэтую работу неабходна працягваць у тым ліку дэлегатам УНС. Кіраўнік дзяржавы парэкамендаваў дэлегатам, каб яны па вяртанні дадому яшчэ раз перачыталі Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, Ваенную дактрыну, вынесеныя на зацвярджэнне УНС, і данеслі асноўныя пасылы да людзей.

«Гэта сур'ёзныя пытанні, усе павінны валодаць гэтымі праблемамі, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Вам трэба будзе адказваць людзям. Таму мы нічога не хаваем, гаворым адкрыта. Мы стварылі найсур'ёзнейшы дакумент. Гэта было няпроста. Абмяркоўвалі асобныя палажэнні на дыялогавых пляцоўках і сёння яшчэ раз больш адкрыта данеслі да вас — дэлегатаў. Слова за вамі».

*(Працяг на 6-й стар.)*